# Рабочая смена

**№2 Ноябрь 2025г.**

Общественно-информационное издание Белоозёрского колледжа электротехники


## ВСТРЕЧА С ДЕПУТАТОМ

24.10.2025 в рамках реализации информационно-образовательного проекта «Шаг» состоялась встреча учащихся колледжа с депутатом Национального собрания Республики Беларусь Кузьминым Олегом Алексеевичем по теме «Конституция Республики Беларусь. Президент Республики Беларусь. Всебелорусское народное собрание. Ветви государственной власти. Государственные награды и премии».

В ходе беседы Олег Алексеевич рассказал об основных направлениях своей работы, обсудил с учащимися и педагогами актуальные вопросы системы образования. Ребята задали целый ряд вопросов и ждут обратной связи.



## АКЦИЯ «ЖИЗНЬ БЕЗ ВЕЙПА»

11 ноября 2025 года в нашем колледже состоялась акция по профилактике курения «Жизнь без вейпа». Ю.Мойсеюк, сотрудник С.Ю.Мойсеюк, сотрудник Берёзовского РОЧС, Е.В.Кондратюк, энтомолог ГУ «Берёзовский центр гигиены и эпидемиологии» и врач-педиатр филиала ЦРБ им. Вержбицкого г. Белоозёрска Ю.Ю. Прищепова привлекли внимание молодежи к проблеме курения и формированию здорового образа жизни. Во время беседы учащиеся колледжа узнали о вреде никотина для здоровья как самого курильщика, так и окружающих, нерожденных детей. Сотрудником МЧС была затронута тема о возгорания аккумуляторов во время их зарядки.

Закончилась встреча выступлением врача-педиат-ра о случаях заболевания подростков от электронных сигарет, о выявленных болезнях и их симптомах.



## ОСЕНЬ ТВОРЧЕСКАЯ

В конференц-зале колледжа состоялась презентация работ в рамках республиканского конкурса «ТехноЁлка» в 10 номинациях, приуроченная Году благоустройта и празднования 80-летия Победы В Великой Отечественной войне.

Основными задачами конкурса было вовлечение молодежи в инновационное научно -техническое творчество, поиск новых творческих методов и приёмов, развития творческой активности, творческого поиска и дизайна.

На суд экспертной комиссии под председательством директора А.В. Шимчука были представлены 34 работы.

В них использованы материалы: дерево, ткани, мех, картон, проволока, ветки, шишки, нитки …



По итогам внутриколледжного этапа компетентным жюри на областной конкурс «ТехноЁлка» 2025 г. по номинациям отобраны экспонаты:

-*«Рождественская композиция»* - «Волшебный фонарь», композиция «Рождественская деревня», игрушки «Братья гномы» и «Барабанчики», конфета «Лединец».

-*«Альтернативная-ёлка»* - «Праздничный апгрейд», светильник «Новогодняя княжна», «Оливье»

-*«Дизайн-ёлка»* - «Сказочная ёлка», «Топотушка», «Снежная королева»

- *«Хайтек-ёлка»* -«Зимняя королева»

13 лучших работ с характеристикой на каждую из них на время второго этапа конкурса принял Национальный детский технопарк (г.Пинск)

# КАБ ВАЛОДАЦЬ СВЕТАМ

Большасць насельніцтва планеты ў дасканаласці валодае толькі адной мовай, той, на якой штодня мае зносіны. Але перафразуючы вядомы афарызм «Хто валодае інфармацыяй – той валодае светам», які належыць брытанскаму банкіру Н.Ротшыльду, можна смела сцвярджаць «Хто валодае мовамі – той валодае светам».

Здаўна лічылася веданне замежных моў неад'емнай прыкметай высокай культуры. І сёння валоданне мовамі з'яўляецца адным з ключавых навыкаў сучаснага чалавека. Калі хочуць падкрэсліць інтэлектуальную перавагу нейкай асобы, пра яе абавязкова скажуць: «Валодае некалькімі замежнымі мовамі». А навукоўцы ЗША выявілі, што тыя супрацоўнікі офісаў, якія валодаюць замежнымі мовамі, лепш выконваюць задачы, якія патрабуюць інтэлектуальных здольнасцяў.

Ні з чым з вышэйсказанага не паспрачаешся. Але да гэтага трэба было прыйсці праз шмат гадоў, калі ўжо за плячыма школьная праграма, вывучэнне інфарматыкі з іншамоўнымі тэрмінамі, а таксама пашпарт, у якім асноўныя запісы зробленыя ў тым ліку і на англійскай мове. Памятаю, самыя першыя англійскія словы я пачула ад стрыечнай сястры Машы, якая некалькі гадоў запар летнія вакацыі праводзіла на востраве Вялікабрытанія ў англійскай сям'і. Гэта былі банальныя фразы тыпу «Як справы?» або «Добрага дня». І на мяне яны тады не аказалі ніякага ўздзеяння.

Сапраўдная сустрэча з замежнай мовай адбылася ў мяне ў 5 класе. У кагосьці ў ранцах ляжалі падручнікі французскай або нямецкай, іспанскай і нават кітайскай мовы. А мне безумоўна пашанцавала - гэта быў падручнік англійскай мовы. На той час мне было ўсё роўна, бо я не разумела, што мне пашанцавала.

Трэба сказаць, што мае аднакласнікі па-рознаму асвойвалі чужаземную гаворку. Адным гэты прадмет не спадабаўся зусім і па паспяховасці яны цягнуліся ў хвасце. Іншыя, да якіх далучылася і я, стараліся «не стукнуць тварам у бруд» і складалі залатую сярэдзіну класа. Але былі і такія (іх, вядома, адзінкі), з якімі настаўнікам было прыемна працаваць – магчыма, аднакласнікі з рэпетытарамі займаліся ці матывацыя бацькоў давала свае вынікі.

Мне з гэтым, можна сказаць, «не пашанцавала». Мама вывучала нямецкую мову, а тата часта мяняў месца жыхарства і школы, таму за гады атрымання адукацыі ён чуў нямецкую, французскую і ангельскуюмовы, але не мог мог паглыбіцца ні ў адну з іх. Таму мне давялося разлічваць толькі на сябе. Гэта, па-першае, а па-другое бацькі могуць толькі зацікавіць дзіця ў вучобе, каб яно ведала, для чаго вучыцца. А вось дапамагаць яму не варта. Я лічу, што і настаўніку таксама адводзіцца важная роля ў стымуляванні матывацыі і цікавасці ў вобласці вывучаемага прадмета. Ці павінны бацькі кантактаваць з настаўнікам замежнай мовы? Лічу гэта лішнім, не бачу ў гэтым сэнсу.




З часам, калі стала вывучаць англійскія тэрміны ў інфарматыцы, мова пачала мне падабацца больш і адразу ж з'явіліся вынікі: адзнакі ўсё часцей сталі пераскокваць праз экватар. Натуральна, я стала больш упэўнена адчуваць сябе на ўроках. Але ў алімпіядах па замежнай мове ніколі ўдзел не прымала па зразумелых прычынах.

Мой прыяцель Марк, з якім пазнаёміліся ў аздараўленчым лагеры паспрыяў мне ў лепшым вывучэнні мовы Брытанскай імперыі: неяк распавёў аб дадатку, якім карыстаецца штодня, каб практыкавацца ў англійскай мове. Я паспрабавала скарыстацца яго парадай. Ён мяне зацікавіў і ў далейшым нядрэнна ўмацаваў мой «падмурак». Я стала з першага разу разумець настаўніка на ўроку. А гэта быў прагрэс. З гэтым дадаткам сябрую і па гэты дзень.

У мяне быў вопыт перапіскі па Інтэрнэце на англійскай мове. Займальна вучылася на памылках і вывучала граматыку. Хацелася б у будучыні паехаць у англамоўную краіну.

Цяпер у мяне не вельмі высокі ўзровень англійскай мовы, але ён дазваляе мне глядзець мноства відэа, фільмаў, чытаць публікацыі.

На мой погляд сучаснікам вельмі патрэбна англійская мова. Нават у многіх сацсетках з веданнем ангельскай мовы колькасць магчымага кантэнту павялічваецца ў разы. Таксама веданне мовы дапамагае ў вывучэнні інфармацыі розных першакрыніц многіх даследаванняў і назіранняў, што дае больш дакладную інфармацыю.

Кітайская, арабская, французская, іспанская мовы – магчыма, некаторыя з іх будуць вывучацца ў школах, бо Беларусь будзе мець адносіны з дружалюбнымі ёй краінамі. Але English незаменна, будзе ў трэндзе.

Таму, хлопцы і дзяўчаты, звяртаюся да вас, вучыце мовы, каб валодаць Светам!

Валерыя Кулініч, гр.17-С

**Издатель: Белоозерский государственный колледж электротехники»**
**Адрес редакции:** 225215 г.Белоозерск,Брестской обл., ул.Энергетиков, 8
E-mail: ptu82@brest.by
**Редактор: Жанна Кулак**
**Редколлегия:** кружок «Юнкор»
**Тираж:** 10
**При перепечатке материала ссылка на газету обязательна**